Рэпазіторый ЦНБ НАН Беларусі - http://library.basnet.by



# Высокая нота Манюшкі

**Сёлета споўнілася 195 гадоў з дня нараджэння выбітнага кампазітара Станіслава Манюшкі, які нарадзіўся на беларускай зямлі. Манюшкі — старажытны шляхецкі род герба «Крыўда» ў Вялікім Княстве Літоўскім і Расійскай імперыі, які быў занесены ў шостую частку радаслоўнай кнігі дваран Мінскай губерні ў 1802 г.**




*Клара Манюшка.*



*Герб Манюшкаў.*

Дзед кампазітара, ваенны суддзя ВКЛ Станіслаў Манюшка, у маладосці быў чалавекам бедным, але ж змог стаць гаспадаром самага вялікага маёнтка ў Літве. Для росквіту памесця ён запрашаў рамеснікаў здалёку, даваў ім грошы на вядзенне асабістай гаспадаркі, будаваў жыллё. У хуткім часе Смілавічы сталі вядомыя далёка за межамі Міншчыны. Тады ж пачынаецца будаўніцтва палаца. Ажаніўся Станіслаў у 51 год з Евай Вайніловіч, дачкой Навагрудскага падчашага. У сям'і нарадзілася 16 дзяцей.

Чатыры дачкі і шэсць сыноў у 1815 г. атрымалі ў спадчыну вялікія фальваркі і грошы. Маёнткі былі падзелены толькі паміж сынамі: Ігнатам, Дамінікам, Юзэфам, Чэславам (бацькам кампазітара), Казімірам і Аляксандрам. Кожны з іх атрымаў па фальварку ў сто хат і 100 тысяч рублёў золатам, а дочкі — па 10 тысяч залатых дукатаў у пасаг. Усе сыны навучаліся ў Віленскім універсітэце. Бацька кампазітара атрымаў у спадчыну непадалёку ад Смілавіч фальварак Убель. У сціплым драўляным дамку каля ракі Волмы 5 мая 1819 года нарадзіўся хлопчык, якому далі імя Станіслаў-Ян-Эдвард-Казімір.

Чэслаў Манюшка паступіў на ваенную службу ў герцагства Варшаўскае ў 1812 г. Пасля вайны служыў у Каралеўстве Польскім. Выйшаў у адстаўку ў 1815 г., ажаніўся з Эльжбетай Маджарскай і пасяліўся ва Убелі. Быў ныдрэнным мастаком і пакінуў пасля сябе 12 альбомаў з партрэтамі, пейзажамі, замалёўкамі вайсковых дзеянняў і сямейных вечароў. Творчыя стасункі звязвалі Чэслава з Валенціем Ваньковічам і Янам Дамелем. Але Чэслаў Манюшка быў не вельмі дбайным гаспадаром, што прывяло да фінансавага краху: у 1842 г. яго фальварак перайшоў у іншыя рукі. Рэшту жыцця правёў у Радкаўшчыне. Яго жонка, пані Эльжбета, мужна трывала шматлікія цяжкасці, клопаты і безгаспадарлівасць мужа. Менавіта яна заўважыла ў сына талент і стала першай настаўніцай Станіслава. У гонар маці пасля яе смерці кампазітар напісаў «Жалобную імшу за душы памерлых».

Дзядзька Станіслава Манюшкі Дамінік арганізаваў у Смілавічах бясплатную школу для местачковай беднаты, вучыў дзяцей рамяству, аддаў прыгонным сваю зямлю, увёў незалежны суд з удзелам сялян. Царскія ўлады, якія скоса глядзелі на такія пачынанні, неўзабаве закрылі і школу, і суд. Другі дзядзька, Казімір, займаўся батанікай, выводзіў новыя гатункі раслін, чым звярнуў на сябе ўвагу прафесара Андрэя Снядэцкага, які прыязджаў да яго ў Смілавічы. Трэці, Юзаф, па святах ставіў аматарскія спектаклі.

У фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваюцца польскія і беларускія выданні, якія распавядаюць пра жыццё Станіслава Манюшкі ў Беларусі і Польшчы, яго дзейнасць як кампазітара, дырыжора, педагога. Адно з вядучых месцаў у даследаванні творчай і эпістолярнай спадчыны належыць польскаму кампазітару і музыказнаўцу, педагогу Вітальду Рудзінскаму. Заслугоўваюць увагі і навуковыя працы Здзіслава Яхімецкага і Станіслава Невядоўскага (Польшча). У Пецярбургу ў 1900 г. пабачыў свет біяграфічны нарыс Баляслава Вільчынскага, прысвечаны С. Манюшку. Польскі музыказнаўца распавядае пра поспех Манюшкавых опер «Галька», «Сялянка» ды інш. (Аўтар лібрэта да першай — варшаўскі паэт Уладзімеж Вольскі, да другой — Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.)



*Дом Станіслава Манюшкі ў Мінску (XIX ст.).*

Жыццёвы шлях славутага земляка можна прасачыць па «Геаграфічным слоўніку Польскага Каралеўства» (Варшава, 1892 г.). Дзяцінства будучага кампазітара прайшло на ўлонні беларускай прыроды, сярод сялян. Вечарамі хлопчык хадзіў у вёску і прагна слухаў песні, якія спявалі, вяртаючыся з поля, дзяўчаты. Разам з бацькамі часта наведваўся ў госці да дзядзькі ў Смілавічы. Той жыў у палацы, які раней належаў Міхалу Агінскаму.

Каб даць сыну адукацыю, сям'я перабралася ў Мінск. У доме на Высокім рынку збіралася мясцовая інтэлігенцыя. Менавіта ў такім асяродку і фарміраваўся талент будучага кампазітара. Маці іграла на фартэпіяна, спявала. Дома ладзіліся музычныя вечары з удзелам музыкантаў і артыстаў. Частымі гасцямі былі стары музыкант і масон Пётр Карафа-Корбут, мастакі Валенцій Ваньковіч і Ян Дамель.

Спакойнае жыццё ў Мінску працягвалася нядоўга: пасля лістападаўскага паўстання 1831 г. бацьку звольнілі са службы па палітычных прычынах. З цягам часу Манюшкі мусілі з'ехаць у Вільню.

Вучыўся будучы кампазітар спачатку ў Вільні, пасля — у Берліне. У Вільні ў 21 год ён ажаніўся з Аляксандрай Мюлер, тут нарадзіліся яго сыны Станіслаў, Баляслаў і Ян. Каб пракарміць сям'ю, Манюшка даваў прыватныя ўрокі, іграў у касцёле святога Яна на аргане. І пісаў музыку. У 1843 г. выдаў у Мінску, куды прыязджаў некалькі разоў, два сшыткі эцюдаў для фартэпіяна.

Плён Манюшку прынесла і сяброўства з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. У выніку на свет з'явіліся чатыры камічныя оперы. Пісьменнік стварыў лібрэта да аперэты «Рэкруцкі набор» на музыку Манюшкі. У 1841-м опера была пастаўлена ў Мінску на ўрачыстасцях з нагоды прыезду віленскага генерал-губернатара Мірковіча.

В. Дунін-Марцінкевіч быў аўтарам лібрэта да Манюшкавай оперы «Цудоўная вада» і яго ж аперэты «Барацьба музыкаў». Найбольшым поспехам карысталася двухактовая опера «Ідылія» («Сялянка»), створаная прыкладна ў 1844 г., — сумесная работа С. Манюшкі і В. Дуніна-Марцінкевіча. Акцёры ў ёй гаварылі са сцэны па-беларуску (а раней — толькі папольску). Першая пастаноўка «Сялянкі» па невядомых прычынах адбылася толькі ў 1852-м у Мінску. Ставіць оперу дапамагалі сябры пісьменніка. Ён прывёз сюды і сялянскі хор са свайго маёнтка Люцынка, а сам выступіў у ролі войта Навума. Спектакль праходзіў у тэатральнай зале дома Паляка, які, на жаль, не захаваўся. Упершыню са сцэны гучала музыка, заснаваная на беларускіх народных мелодыях. Пазней оперу ўдалося паставіць і ў іншых гарадах: Бабруйску, Віцебску, Нясвіжы, Слуцку і нават Глуску.

Оперу «Галька» 1 студзеня 1848 г. выканалі віленскія аматары. Неўзабаве кампазітар паслаў партытуру ў Варшаву. Але яна не спадабалася цэнзуры і 10 гадоў праляжала на паліцы варшаўскай тэатральнай бібліятэкі. Яе паказалі ў Мінску і Гродне ў 1856-м (у Варшаве прэм'ера адбылася толькі праз два гады).

Жывучы ў Вільні, а потым у Варшаве (1850 — 1860-я гг.), кампазітар часта прыязджаў у Мінск — пагасцяваць у беларускага сябра, пабачыць бацьку і сваякоў, якія жылі ў Радкаўшчыне, ля Смілавіч.

У 1861 г. Манюшка пабываў у Каралішчавічах, ля Мінска, і з захапленнем пісаў пра мясцовы арган, зроблены ўмельцам Бяляўскім. Асабліва памятным быў для Манюшкі прыезд у Мінск у кастрычніку 1856 г., калі тут праводзіліся шляхецкія выбары. Да прыезду ганаровага госця была прымеркавана вечарына, дзе прысутнічалі артысты і літаратары. Усе з захапленнем слухалі расповед С. Манюшкі пра оперу «Галька» і ўрыўкі з твора ў аўтарскім выкананні.

Творы кампазітара друкаваліся і ў Мінску, і ў Вільні. Асобнае месца сярод віленскіх выдавецтваў належала друкарні Ю. Завадскага. У фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца выданні, якія выйшлі пры жыцці вялікага кампазітара ў віленскіх друкарнях сярэдзіны XIX ст. Ёсць вельмі каштоўнае выданне Уладзіслава Сыракомлі (сябра Манюшкі) «Дачка Пястаў», у якім змешчаны музычны твор С. Манюшкі «Паходная песня ліцвінаў». На пажоўклым ад часу аркушы мудрагеліста ўплеценая ў арнамент назва песні на словы У. Сыракомлі.

Найбольшай папулярнасцю на беларускай зямлі карыстаўся «Хатні спеўнік» С. Манюшкі. У гэты зборнік увайшлі песні, створаныя на беларускім і польскім фальклорным матэрыяле. Іх вучылі, спявалі, перапісвалі. З выхадам у свет «Хатняга спеўніка» завязалася ліставанне С. Манюшкі з Я. Чачотам, абодва цікавіліся беларускім меласам. Аўтар «Хатняга спеўніка» звярнуўся да Яна Чачота з просьбаю дасласць яму вершы ў народным стылі, і апошні выканаў гэтую просьбу.

Падчас працы над зборнікам кампазітара захапляўся народнымі мелодыямі. Бацька, які ведаў пра гэта, у лісце да сына даў падрабязнае апісанне беларускай «Лявоніхі» і спеваў, якія назіраў і слухаў на Радашкоўшчыне. У 1837 г. у Віленскім выдавецтве Завадскага пабачыў свет зборнік песень Станіслава Манюшкі на вершы Яна Чачота пад назвай «Вясковыя песенькі з-над Нёмана», у які ўвайшло 100 беларускіх песень у перакладзе на польскую мову.

З сучасных выданняў трэба адзначыць унікальны зборнік твораў, які ўпершыню пасля смерці кампазітара быў выдадзены на яго радзіме, — «Песні з-пад Нёмна і Дзвіны», дзе ўпершыню сабраны і выдадзены ўсе 22 песні класіка на вершы аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Яна Чачота. Песні перастворваны па-беларуску У. Мархелем, У. Дубоўкам, К. Цвіркам, Я. Міклашэўскім, З. Трашчкоўскай… У бібліятэцы захоўваюцца кнігі з аўтографамі і дарчымі надпісамі айчынных даследчыкаў творчасці Станіслава Манюшкі — Браніслава Смольскага, Віктара Скорабагатава, Адама Мальдзіса, Уладзіміра Мархеля і інш.

У 2009 годзе Цэнтральную навуковую бібліятэку імя Якуба Коласа наведала прапраўнучка вялікага кампазітара, прафесар Парыжскай кансерваторыі, прэзідэнт Асацыяцыі імя С. Манюшкі спадарыня Клара Манюшка, якая ўпершыню прыехала на радзіму свайго прапрадзеда. Яна азнаёмілася з прыжыццёвымі выданнямі кампазітара і даследаваннямі яго творчасці, што захоўваюцца ў кнігазборні. Падчас мерапрыемства быў прадэманстраваны фільм пра жыццё і дзейнасць кампазітара, падрыхтаваны супрацоўнікамі аддзела маркетынгавых даследаванняў. Копія яго была падаравана спадарыні Клары Манюшка.

**Алена ДЗЕНІСЕНКА**